**Дубкоў,** Я. Вайсковы старшына Новікаў / Я. Дубкоў // Сцяг Перамогі (Лёзна). — 2009. — 7 лют. — С. 4.

## ВАЙСКОВЫ СТАРШЫНА НОВІКАЎ

Прызываўся для праходжання тэрміновай службы ў радах Савецкай Арміі Аляксандр Новікаў з роднага горада Орша. Да гэтага часу юнак паспеў набыць прафесіі медыцынскага фельчара і вадзіцеля. Ён і пачаў службу вадзіцелем у пагранічных войсках на мяжы Туркменіі з Афганістанам.

Гэта быў май 1987 года. Савецкія воіны, большасць з якіх складалі зусім маладзенькія юнакі, дапамагалі братняму афганскаму народу адстойваць дэмакратыю і незалежнасць. Шмат разоў у саставе калоны ваенных грузавікоў Новікаў перасякаў дзяржаўную мяжу, перавозіў у Афганістан патрэбныя там грузы. Не заўсёды абыходзілася спакойна, былі напады варожых сіл, гарэлі машыны, у сутычках гінулі людзі з абодвух бакоў. Загінуў там і лепшы сябра Аляксандра, які прызываўся з Падмаскоўя.

І затым, калі праз дзесяць месяцаў службы быў пераведзены ў палкавы медыцынскі пункт у якасці фельчара, шмат разоў браў удзел у баявых дзеяннях на тэрыторыі Афганістана. 19-гадовы юнак увачавідку бачыў жахлівыя малюнкі вайны, аб якіх яму цяпер зусім не хочацца ўспамінаць. Дэмабілізаваўся ў званні старшыны. Яго баявыя заслугі адзначаны медалямі «За выдатнасць у ахове дзяржаўнай граніцы», «Ад удзячнага афганскага народа».

Вярнуўшыся на радзіму, працаваў у Віцебску на цэнтральнай станцыі хуткай дапамогі, затым у следчым ізалятары. І вось ужо прайшло шмат гадоў, як лёс звязаў Аляксандра Сямёнавіча з Лёзненскім РАУС. Цяпер капітан міліцыі Новікаў служыць тут на пасадзе старшага інспектара-дзяжурнага аператыўна-дзяжурнай службы.

**Я. Дубкоў**